*А.В. Шаціло,*
*выкладчык кафедры народнага*
*дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

# НАРОДНАЯ МІФАЛОГІЯ Ў СУЧАСНЫМ САЛОМАПЛЯЦЕННІ

Міфалагічныя вобразы народнай культуры працягваюць сваё жыццё ў сучасным дэкаратыўна-прыкладным мастацтве Беларусі. Яны з’яўляюцца крыніцай натхнення сучасных мастакоў і сэнсавай асновай іх твораў. Існасць міфалогіі – пераварэнне хаосу ў космас на любым узроўні, а гэта стварэнне пэўнай сістэмы, прасторава-часавай структуры. Гэткая ж мэта знаходзіцца ў аснове любога твора народнага мастацтва. Яго сімвалічная структура ўвасабляе ўяўленні пра рэчаіснасць, а таксама суадносіны архетыпічных міфалагічных мадэляў са сферай свядомасці мастака, якая па сваіх законах будуе канструкцыю на ўсіх узроўнях: ад сюжэтна-кампазіцыйнага да знакавай сістэмы твора.

Мастацтва не толькі ў сваіх розначасовых, але і ў сваіх адначасовых сістэмах надзвычай пластычнае, рухомае, і немагчыма паставіць яго ў якія-небудзь статычныя тэарэтычныя межы. Асэнсаванае і зразумелае аднойчы, можа з’яўляцца бяссэнсавым і незразумелым у сваім новым стане [2, с. 196]. Таму апісанне і аналіз сімволікі народнага мастацтва магчымы толькі ў вызначаным кантэксце і толькі ў сувязі з пэўнай культурнай традыцыяй ці сэнсавай сітуацыяй. Так, у мастацтве заўсёды існуюць знешнія і ўнутраныя фактары выкарыстання сімвалаў. Знешнія – гэта традыцыйнасць пэўных уяўленняў, вобразаў у сістэме культуры, унутраныя – іх інтэрпрэтацыя ў свядомасці мастака. Кожны твор мастацтва мае сваю ўласную логіку ўнутранай структуры і сэнсу. Формаўтварэнне ў народным мастацтве залежыць ад зместу, кампазіцыю знакаў і сімвалаў утварае семантыка. У сучаснасці спецыфіка стварэння і функцыянавання сімвалаў у народным мастацтве, інтэнсіўнасць іх сэнсавага напаўнення і выкарыстання абумоўлены ўласнай дасведчанасцю мастака ў міфалогіі і сімволіцы народнай культуры.

Адметнай асаблівасцю народнай творчасці з’яўляюцца не суб’ектыўныя, сітуатыўныя ўмовы стварэння сімвалаў, а ўстойлівыя, якія вызначаюцца стагоддзямі і характарызуюцца калектыўнасцю і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

традыцыйнасцю. Аналіз вытокаў, шляхоў развіцця, функцыянавання і трансфармацыі вобразна-сімвалічнай сістэмы народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва паказвае, што ў ёй захавалася шмат архаічных элементаў перыяду індаеўрапейскай агульнасці, а таксама вылучаюцца адметныя рысы беларускай нацыянальнай культуры ў межах усходнеславянскай супольнасці.

Мастацтва саломапляцення мае сваёй асновай вельмі старажытныя магічныя ўяўленні пра вялікую творчую сілу ўрадлівасці, што адлюстроўваецца ва ўяўленні пра цыклічнасць часу, вечнае кола смерці і ўваскрэсення. Народная абраднасць, фальклор, запісы этнографаў другой паловы XIX – пачатку XX ст. даюць багаты матэрыял для рэканструкцыі светапогляднай глебы мастацтва саломапляцення, выкарыстання саломы і вырабаў з яе падчас абрадаў і рытуалаў.

Далей канструктыўна-тэхналагічныя прыёмы пляцення набываюць сваё развіццё па-за абрадам, і гэта ўжо не патрабаванне міфалогіі. Удасканаленне тэхнік пляцення, эстэтызацыя знешняга выгляду прыводзяць да развіцця саломапляцення як аднаго з відаў народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

У сучасным саломапляценні Беларусі можна вылучыць асноўныя матывы, якія адлюстроўваюць старажытную касмагонію і старажытную структуру Сусвету. Адным з найбольш распаўсюджаных і вядомых міфічных уяўленняў старажытных народаў з’яўляецца міфалагема «Сусветнае дрэва», «Дрэва жыцця» – універсальны сімвал, які разглядаецца як ідэальная мадэль дынамічных працэсаў па вертыкалі і адначасова ўстойлівай структуры па гарызанталі [3, с. 214]. Кампазіцыйная схема Сусветнага дрэва ўяўляе сабой сістэму пабудовы Космасу як ўвасабленне ўніверсальных параметраў прасторы і часу. Трохчасткавая па вертыкалі: мінулае, сучаснае, будучыня; альбо неба, зямля, падземны свет. І чатырохчасткавая па гарызанталі, ці ў прасторы: поўнач, поўдзень, захад, усход. У межах гэтай сістэмы першаснымі пры міфалагічнай сімвалічнай класіфікацыі з’яўляюцца адносіны ў выглядзе элементарных семантычных апазіцый: прасторавыя – верх/ніз, правы/левы; прасторава-часавыя – неба/зямля, поўнач/поўдзень; фундаментальныя – жыццё/смерць і г.д. [3, с. 230]. У далейшым назіраецца пераход ад семантычных апазіцый да пабудовы складанай сістэмы, калі класіфікацыйныя магчымасці бінарнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

логікі пашыраюцца за кошт іерархічнага падзелу свету на ўзроўні [3, с. 233].

Дадзеная канцэпцыя Сусвету, якая адлюстроўвае бінарныя мадэлі і дуальнасць усяго існага, шматаспектна і шматварыянтна трансліравалася ў народным мастацтве. Яна прысутнічае ў тканых посцілках і рушніках, маляваных дыванах. Таксама яна цікавіць і сучасных мастакоў, якія выключна індывідуальна трактуюць і ўвасабляюць яго ў такім матэрыяле, як салома.

Пры гэтым калі твор выраблены без пэўных сэнсавых абмежаванняў, яго знакавая сістэма набывае абстрактны характар, а самі знакі не маюць дакладных значэнняў, то магчыма любое іх спалучэнне, і трактоўка сімволікі твора становіцца непрадказальнай. Увесь сімвалічны ўзровень цалкам ствараецца асобай майстра.

Што тычыцца дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва сярэдзіны XX – пачатку XXI ст., калі ў свядомасці мастакоў ні хрысціянства, ні традыцыйна народныя ўяўленні не займаюць месца бясспрэчнай дамінанты, сэнсы сімвалаў узнаўляюцца з літаратурных крыніц, асабліва калі мастак не мае непасрэдных зносін з носьбітамі аўтэнтычнай інфармацыі – майстрамі, шмат пакаленняў якіх працавалі ў гэтым матэрыяле.

Усе абрадавыя саламяныя вырабы мелі магічны сэнс, яны не жылі як асобныя творы мастацтва, а існавалі толькі ў межах пэўных рытуальных дзеянняў. Згодна прынцыпу цыклічнасці яны зноў і зноў ствараліся кожны г., і захаваліся нягледзячы на гістарычныя і рэлігійныя змены на працягу тысячагоддзяў. Гэтая трываласць старажытных ўяўленняў дае нам падставу вылучыць міфалогію і народную абраднасць як пачатковую кропку пры рэканструкцыі сімвалічных сэнсаў саломапляцення.

Разам з тым салома выкарыстоўвалася не толькі ў абрадавым комплексе, але і для вырабу розных прадметаў выключна бытавога, утылітарнага прызначэння. Пры гэтым добра прасочваецца наяўнасць іншых тэхнік пляцення, што ўскосна можа сведчыць пра сэнсавы падзел бытавых рэчаў і магічных. Таму можна выказаць некалькі меркаванняў наконт саміх тэхнік пляцення. На падставе аналізу светапогляду і прысвечанасці рытуальных дзеянняў багам (як персаніфікаваным, так і неперсаніфікаваным) можна прыйсці да высновы, што саломапляценне заснавана на магічным дзеянні «захавання сілы», якое знайшло сваё тэхнічнае ўвасабленне ў пляценні, перакручванні, завязванні вузлоў. Так, прынцып

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перакладання саломін адну праз адну ляжыць у аснове арабскай клеткі (arabic cage) і круглага пляцення – адной з асноўных тэхнік, якая назіраецца ва ўсіх традыцыйных жніўных упрыгожаннях [1, с. 60–63], [4, с.176]. Пра старажытнасць, магічныя функцыі гаворыць і англійская назва традыцыйнага для саломапляцення Беларусі элемента – ромба – God'sEyes (вочы бога). «Яны былі вядомы як пасткі для нячыстай сілы на Тыбеце, дзе падвешваліся да дахаў» [4, с. 124]. Гэты вельмі просты спосаб пляцення адной саломінай вакол дзвюх палачак, складзеных у форме крыжа, сустракаецца ў розных рэгіёнах свету.

Такім чынам, абрадавая творчасць, неадрыўна звязаная з матэрыяльнай і духоўнай культурай, заклала аснову саломапляцення, сфарміравала асноўныя мастацкія і тэхнічныя прыёмы гэтага віду дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. А сімволіка саломы, звязаная з асноўнай ідэяй народнай аграрнай абраднасці – ідэяй урадлівасці, нарадзіла шматлікія сімвалічныя сэнсы і формы выкарыстання матэрыялу.

Спалучэнне традыцый з новымі знаходкамі дазволіла саломопляценню развівацца ў прасторы сучаснага мастацтва. Майстрамі было прыдумана шмат новых аўтарскіх тэхнік пляцення. Адыход ад традыцый у канструктыўных, тэхнічных прыёмах, яркая індывідуальнасць творчасці пры гэтым не з'яўляюцца сутнасным адыходам ад традыцый народнай культуры. Фальклор застаецца крыніцай мастацкіх вобразаў. І калі раней саламяныя вырабы мелі выражаны «прыкладны» характар, рабіліся менавіта да пэўнага свята і рытуалу: чучалы на Купалле, маскі на Каляды, лялькі да вяселля, жніўны сноп па заканчэнні працы ў полі і г.д., то зараз традыцыйнай абрадавай атрыбутыцы надаецца самастойнае жыццё ў мастацтве.

Такім чынам, мастацтва саломапляцення вызначаецца змяненнем функцый – ад уключанасці ў рытуальны комплекс у старажытнасці да аўтаномнага існавання ў выглядзе самадастатковых дэкаратыўных твораў.

1. *Лобачевская, О. А.* Плетение из соломки / О. А. Лобачевская. – М. : Культура и традиции, 2000. – 208 с.

2. *Лосев, А. Ф.* Знак. Символ. Миф : тр. по языкознан. / А. Ф. Лосев. – М. : Изд-во МГУ, 1982. – 479 с.

3. *Мелетинский, Е. М.* Поэтика мифа / Е. М. Мелетинский. – М. : Наука, 1976. – 408 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*4. Andrew, H. E. Laye.* The Batsford Encyclopedia of Crafts / H. E. Laye Andrew. – London : BT Batsford LTD, 1978. – 431 p.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ